Wilno, 25.II.1939. „SZLACH MOŁADZI“ № 4 (146). Rok XI.

Шлях Моладзі

Šlach Moładzi

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

№ 4 (146). Вільня, 25 Лютага 1939 г. Год XI.

ПАТРЭБА ПРОМЫСЛУ Ў НАШЫМ КРАЮ

Асноўнымі элемэнтамі разьвіцьця сельскай гаспадаркі ня толькі ў нашым Краю, але й агулам у сьвеце, зьяўляюцца: капітал, праца і аканамічныяўмовы сельскай гаспадаркі. Ад самага пачатку свайго разьвіцьця нашая сельская гаспадарка мела ў той ці іншай меры толькі два першыя элемэнты: капітал ды працу (пад словам »капітал« трэба тут разумець варштат працы гаспадара—зямлю, — праца-ж— азначае рабочыя рукі). Восьжа, як расейскі ўрад калісь, а польскі цяпер, нажаль не разьвівалі належна сельскую гаспадарку.

Як прыклад розных адносінаў да земляробства, падамо тут былую царскую Расею і Нямеччыну. Расея да вайны была на 80—90 прац. земляробскай краінай, міма таго земляробскай палітыкі не вяла. Зусім інначай было ў Нямеччыне. Там вясковага насельніцтва было ўсяго каля 43 прац., рэшта гэта рабочыя і іншыя слаі насельніцтва. Умовы для збыту сельскіх прадуктаў былі вельмі добрыя. Але гэтага мала. Урад Нямеччыны накладаў высокае мыта (цло) на ўвожаныя з заграніцы сельскія прадукты, што прычынялася да павышэньня цэнаў сваіх земляробскіх прадуктаў. Такая палітыка падвышала кошты ўтрыманьня рабочых, што ў сваю чаргу адбівалася на дарагоўлі прамысловых тавараў, якія ішлі за граніцу. Аднак урад Нямеччыны ўважаў, што трэба дбаць перадусім аб свой нутраны рынак. Калі селянін багаты і мае што добра збыць, то ён добры купец на прамысловыя вырабы, і наадварот — чым бяднейшы селянін, тым ён менш купляе, а знача— няма збыту на фабрычныя тавары, што ўжо цягне за сабой агульны застой. Таму мы й бачым такое прыгожае разьвіцьцё перад вайной нямецкай сельскай гаспадаркі. На'т цяпер яшчэ польская палітыка можа хваліцца высокім узроўнем сельскай гаспадаркі ў Пазнаншчыне, якая перад вайной знаходзілася пад Нямеччынай. Пасьля вайны сельская гаспадарка ў Пазнаншчыне занепадае, як гэта даказваў прафэсар Пазнанскага Унівэрсытэту Зыгмунд Петрушчынскі. Вось што значаць эканамічныя ўмовы будучыя адным з галоўных дзейнікаў разьвіцьця сельскай гаспадаркі, які мы паставілі побач зямлі і працы. Як толькі Пазнаншчына ня мае спрыяючых эканамічных абставінаў, наўперад нямецкага рынку, сельская гаспадарка занепадае. Зямля асталася тая самая, і тыя самыя людзі на ёй гаспадараць, а ўжо вынік іншы.

Падобную да нямецкай палітыкі вялі і вядуць амаль усе гаспадарствы, дзе земляробства стаіць высока. Гэтага ня было ў Расеі. Эканамічныя абставіны на гэтулькі важныя, што на'т самі сяляне, ня знаючы шырокай эканамічнай палітыкі, гавораць інструктарам і аграномам, якія іх вучаць гаспадарыць: — »дайце нам тут рынак збыту, фабрыку на пару тысяч рабочых, менш трэба будзе гаварыць. Мы-ж і самі знаем, як і што нам аплаціцца садзіць, сеяць і г. д., і г. д.» Дамаганьні зусім правільныя. Але да зьдзейсьненьня іх на жаль ня йдзе, абставіны нашага эканамічнага жыцьця далёка не такія, якія трэба каб былі.

Промыслу на нашых землях так, як і няма. Большыя гарады можна палічыць на пальцах аднэй рукі. Рынак збыту слабы. Гарады і мястэчкі ў нас не разьвіваюцца, а занепадаюць. Даволі напр. сказаць, што ў некаторых паўночных мястэчках Віленшчыны колькасьць насельніцтва, у параўнаньні з перадваеннымі часамі, зьменшылася. Таму мы вось з году на год памаленьку бяднеем. Нічога тут не паможа тая гаспадарчая работа, якая вядзецца цяпер на нашых землях. Работу гэтую можна параўняць да ўколаў хвораму лякарства. Нам трэба ня ўколаў а вялікай разбудовы промыслу. Толькі тут нажаль ізноў бачым, як нашыя землі ў канцы ўвагі эканамічнай дзяржаўнай палітыкі. Год таму назад быў створаны Цэнтральны Прамысловы Вокруг— Centralny Okręg Przemysłowy,— які мае на мэце падняць эканамічна польскую вёску, якую гэты вокруг абыймае. Насельніцтва гэтага вокругу найбяднейшае ў Польшчы. На абшары гэтага вокругу адбыліся ў 1938 г. бурныя дэманстрацыі і сутычкі сялян з паліцыяй. Цяпер, пасьля аднаго году працы промыслу, абставіны зьмяніліся. І ўжо прэм'ер генер. Складкоўскі ў Сойме аб гэтым абшары гэтак гаворыць:— «калі былі сутычкі

(1937) з паліцыяй, я там быў. Сапраўды, сяляне зараблялі мала, выглядалі кепска, былі злыя. Цяпер (1938 год) я езьдзіў ізноў туды. Селянін зарабляе,—хапае яму на хлеб, хапае і на кусок мяса, выгляд чалавека зьмяніўся.» — Раю там пэўнеж няма, але палажэньне насельніцтва ўсё-ж палепшылася.

Для нашага народу з гэтага навука,што трэба канешна ўпрамыслаўляцца. Промысел — гэта пытаньне нашага жыцьця і сьмерці. Дзеля таго, што мы паміраць ня зьбіраемся, мусім дабівацца зьмены адносінаў дзяржаўных уладаў да нас. І тут ужо наступае патрэба іншай акцыі, якая мае на мэце паставіць беларускае пытаньне ўва ўсей яго шырыні. Акцыя гэта мусіць кіравацца наўперад да таго, каб Беларусы мелі свае сьведамае прадстаўніцтва ў самаўрадах, а так-жа ў парлямэнце. Мусім адначасна тварыць сільную нацыянальную адзінку, каб дабіцца сабе належнага месца пад сонцам. З.

PAMIOR PAPA RYMSKI PIUS XI

10 lutaha sioleta ŭ Rymie pamior hałoŭny kiraŭnik Katalickaha Kaścioła św. Ajciec Papież Pius XI. Z pachodžańnia byŭ jon Italjancam. Radziŭsia 31.V.1857 h. u m. Desio kala Medjolanu. Nazyvaŭsia Ambrožy Dziamian Achilles Ratti. Končyŭšy navuki i zdabyŭšy tytuł doktara filozolii, teolohii i kananičnaha prava, u 1879 h. paśviaciŭsia jon u ksiandzy i niezadoŭha pačaŭ zajmać što-raz vyšejšyja i bolš adkaznyja stanoviščy ŭ Katalickim Kaściele. Adnačasna zajmaŭsia jon navukovaj pracaj i napisaŭ mnoha roznych cennych knižak Vialikija zdolnaści ks. Ratti ahc žviarnuli na jaho ŭvahu Papieža Benedykta XV, katory naznačyŭ jaho ŭ 1918 h. svaim pradstaŭnikom — nuncyjam u Polščy, a paśla ks. Ratti byŭ paśviačany ŭ biskupy, nastupna ŭ kardynały i ŭrešcie 6.II.1922 h., paśla śmierci Benedykta XV, vybrany na Papieža; pryniaŭ sabie imia Piusa XI.

Papież, ci lepš mo' budzie pabiełarusku Papa Pius XI byŭ sapraŭdy čałaviekam vialikim, stojkim, hodnym imia pravadnika relihijnaha žyćcia, abaroncam chryścijanskaje etyki i duchovaha raźvićcia čałavieka. Heta pryznajuć nia tolki kataliki, nia tolki ludzi relihijnyja, ale navat vorahi Katalickaha Kaścioła i tyja ludzi, katoryja ahułam nia chočuć pryznavać nijakaje relihii. Papa Pius XI luboŭju ahartaŭ usie narody, adkidaŭ usiakuju nienaviść i baraniŭ volnaść čałavieka i narodu, jak najvyšejšaha hramadzkaha ideału. Dziela taho rašuča vystupaŭ jon i praciŭ kamunizmu i praciŭ fašyzmu, i praciŭ inšych roznarodnych totalizmaŭ, katoryja ahraničajuć ludziam svabodu, zavodziačy dyktaturu niekatorych tolki hrupaŭ ludziej.



PAPA PIUS XI

Pamiatavaŭ uściaž Pius XI ab doli i kryŭdzie pracoŭnych masaŭ, i ŭ mieru siłaŭ imknuŭsia, havaryŭ, vydavaŭ adpaviednyja encykliki (pasłańni), zaklikajučyja da spraviadlivaha padziełu pracy i bahaćciaŭ.

Pamiatavaŭ i adnolkava pabaćkaŭsku adnosiŭsia Papa Pius XI da ŭsich narodaŭ. Znaŭ jon i Biełarusaŭ. Budučy nuncyjam u Polščy i adviedvajučy ŭ studzieni 1920 h. Vilniu pryniaŭ delehacyju Biełarusaŭ katalikoŭ. U 1921 h. u Varšavie adviedaŭ jaho ks. Ad. Stankievič. U Rymie-ž u Papy Piusa XI byvali na pryniaćciach nastupnyja ksiandzy Biełarusy: F. Abrantovič, A. Cikota, J. Tarasevič, J. Hermanovič, Fr. Čarniaŭski i inš., katorych zaŭsiody paciašaŭ i padtrymlivaŭ na duchu. U minułym-ža 1938 h. z Rymu pryjšła ŭ Vilniu hrašovaja pomač na vydańnie Św. Piśma pabiełarusku, jakoje znachodzicca ciapier u druku.

Praŭda, narod naš dalej ksiandzy navučajuć Božaha Słova papolsku, ale vina ŭ hetym nia Rymu i Apostalskaj Stalicy. Bo treba viedać, što ŭ Katalickim Kaściele majuć vielmi vialikija pravy miascovyja biskupy, pry tym adyjhryvajuć vialikuju rolu silnyja fizyčna hetaha śvietu... Apračа taho patrebnyja ŭ hetym pastajannyja damahańni Biełarusaŭ svaje rodnaje movy ŭ śviatyniach, až da akančalnaha ździejśnieńnia hetych damahańniaŭ, katoraje musić raniej ci paźniej nastupić. I Papa Pius XI zvaročvaŭ vialikuju ŭvahu na toje, kab ułasnaje duchavienstva kožnaha narodu pašyrała Chryścijanstva i navučała ludziej u ich rodnaj movie. Imienna za časoŭ Piusa XI paŭstała katalickaje duchavienstva siarod Nehraŭ, Kitajcaŭ, Indusaŭ, Japoncaŭ i inš.

Ahułam dziejnaść Papy Piusa XI była vialikaj. Dyk i nia dziva, što śmierć Jahonaja akryła žałobaj badaj uvieś kulturny śviet. **Z. B.**

Мечыслаў Карловіч

(З прычыны 30-тых угодкаў ягонай сьмерці)

8 лютага сёлета мінула трыццаць гадоў ад дня трагічнае сьмерці аднаго з найвызначнейшых музыкаў, якіх выдала беларуская зямля,— Мечыслава Карловіча: згінуў ён у цьвеце гадоў пад раптоўна абсунуўшайся на яго масай горскага сьнегу ў Татрах, пад м. Касьцельцам, недалёка ад ведамага курорту для сухотнікаў Закапанае. Меў ён тады скончаных усяго 32 гады. На месцы, дзе ратаўніцкая экспэдыцыя знайшла скасьцянеўшае цела М. Карловіча, стаіць сяньня вялізны камень, з адпаведным надпісам хранолёгічным, закончаным славамі: »Non omnis moriar.»

Нашто ўсё гэта аб М. Карловічу мы ўспамінаем! Ці ня хочам яго забраць ад Палякоў, для каторых ён праз свае кароткае жыцьцё так горача служыў, запісваючы на дадатак Варшаўскаму Музыкальнаму Т-ву нават усю сваю маемасьць?

Адкажам коратка. Робім гэты ўспамін: 1. каб аддаць належную дань чалавеку, які жыцьцё свае і здольнасьці складаў безінтэрэсоўна на аўтар красы, мастацтва, 2. каб адцеміць, што гэты чалавек, хоць выйшаў з асяродзьдзя памешчыцкага, ня толькі не баяўся і ня чураўся народнай песьні беларускай, але сам гэту песьню пад-

хапляў і тварыў з яе недасягальныя цуды, урэшце 3. успамінаем, «колькі талентаў зьвялося, колькі іх і дзе ляжыць!?» таму толькі, што ў іхнюю пару разьвіцьця і працы беларускія народныя масы йшчэ ня былі належна аб сабе ўсьвядомлены. Адна толькі музыка страціла на гэтым такіх адзінак вырасшых з нашай зямлі, як Глінка, як Манюшка, як урэшце М. Карловіч.

—о—

Мечыслаў Карловіч, адзін з трох дзяцей ведамага этнографа і языкаведа Яна Карловіча, радзіўся 11.XII.1866 г. у двары Вішнева, у той час Сьвянцянскага, сягоньня Вялейскага павету. Па сканчэньні сярэдняй школы, музыкі вучыўся ў краі і заграніцай (праф. Г. Урбан, Бэрлін). Ад малых дзён М. Карловіч не расставаўся з скрыпкай, але ў пару мастацкага дасьпяваньня перайшоў бадай выключна ў клясу композытарства. Быў пад уплывам Чайкоўскага, Вагнэра і Р. Штраусса. Славу сабе здабыў сваімі **сымфонічнымі паэмамі**, з якіх найважнейшыя:«Паваротныя хвалі» (Opus 9), „Тры адвечныя песьні“ (Opus 10) і ўрэшце бязсьмертная ягоная **„Літоўская рапсодыя,“** напісаная на матывы **беларускіх** народных песьняў. Гэта рапсодыя, названая аўтoрам »літоўскай“ (у значэньні гістарычным), адбівае ў сабе сум беларускай прыроды і самага народу, спалучаныя ў адну цэласьць. Адбываецца ў сымфоніі для контрасту і мотыў весялейшы, які аднак узноў пераходзе ў яшчэ глыбейшую задуму. Усё гэта вялікі Мастак глыбака адчуваў з акружаючай прыроды і выліў у сваей пэрле—»Літоўскай рапсодыі.» —


Сяньня ў 30 гадоў па сьмерці М. Карловіча, калі гэтак цяжка пачуць публічнае выкананьне ў мастацкай форме беларускай песьні, можам яшчэ часам пачуць М. Карловічаву „Рапсодыю літоўскую“. — Паслухайма-ж яе хоць-бы ў перадачы „Польскага Радыя.“ І не адкладайма, бо хто ведае, ці там з часам ня выракуцца і М. Карловіча, як выракліся улюбленай ім беларускай песьні і як Варшаўская фільгармонія выракласяся самага М. Карловіча яшчэ пры ягоным жыцьці. Не адкладайма! Гэтым хоць ушануйма памяць Вялікага Сына нашай Зямлі.

Беларус

ŠVIATA RADAŠCI LITOŬSKAHA NARODU

Sioleta 16-ha lutaha śviatkavali Litoŭcy ŭžo 21-ja ŭhodki isnavańnia svajho niezaležnaha haspadarstva — Litvy. U hety dzień uspaminali Litoŭcy svaju minuŭščynu, svajo daŭniejšaje haspadarstviennaje žyćcio, niavolu, baraćbu z čužoj akupacyjaj, a tak-ža rabili pierahlad tych zdabyčaŭ, jakija dało im svajo novaje niezaležnaje haspadarstva. Dzień abvieščańnia niezaležnaści Litvy — 16 lutaha — ŭračysta śviatkavali i Litoŭcy ŭ Vilni, a vitali ich pradstaŭniki Biełarusaŭ i Ukraincaŭ. Nacyjanalnaje śviata Litvy śviatkavali i litoŭskija emihranty, ciažki los katorych u časoch carskaje niavoli zakidaŭ časta na dalokuju čužynu. Najbolš adnak uračystym i radasnym dniom byŭ 16 luty siarod tych Litoŭcaŭ, katoryja žyvuć u svaim haspadarstvie i karystajuć z dabradziejstvaŭ i apieki jaho. I sapraŭdy, Litoŭcy majuć čym ciešycca. Voźmiem choć-by karotki ahlad zdabyčaŭ Litoŭskaha Narodu ŭ svaim haspadarstvie, jaki sioleta na Novy Hod rabiŭ litoŭski premjer ks. V. Mironas. Z pramovy jaho daviedvajemsia ab Litvie nastupnaje:

Aśvieta. U hetaj halinie ŭ 1920 h. było tolki tysiača pačatkavych škoł i 70 tysiač vučniaŭ. Ciapier — u minułym hodzie — ŭ Litvie isnavała 2,5 tysiač pačatkavych škoł i 300 tysiač vučniaŭ. Biazhramatnych siarod novaha pakaleńnia niama susim. U halinie aśviety siaredniaj — u 1920 h. było 40 siarednich škoł i 9 tysiač vučniaŭ. Ciapier isnuje 90 himnazijaŭ i 18 tysiač vučniaŭ, a tak-ža cely rad roznych škoł adumysłovych i 8 tysiač vučniaŭ. U 1920 h. było vypuščana 90 abiturjentaŭ, a ciapier kožny hod kančaje siarednija škoły zvyš tysiačy asob. Praz uvieś čas niezaležnaści Litvy litoŭskija himnazii vypuścili kala 17 tysiač abiturjentaŭ, a ŭniversytet daŭ 3,200 asob z vyšejšaj aśvietaj.



Pamiatnik svabody ŭ Kaŭnasie pry litoŭskim universytecie im. Vitaŭta Vialikaha.

Presa. Na pačatku niezaležnaści Litvy ŭsich hazet vychodziła da 20 tysiač ekzemplaraŭ, a ciapier vychodzić zvyš paŭtarasta peryjodyčnych vydańniaŭ z tyražom da miljona ekzemplaraŭ. Adzin časapis prypadaje što treciamu žycharu.

Ziemlarobstva, jakoje prad vajnoj stajała nizka, ciapier pajšło daloka ŭpierad: reforma ziamielnaja, chutaryzacyja, palepšańnie haspadarańnia, lepšyja sarty nasieńnia i lepšyja hatunki žyvioły, melioracyja, dziakujučy jakoj zdabyta 450 tysiač hektaraŭ aromaj ziamli.

Promysieł i handal vyras taksama. Pradusim duža vysoka raźviŭsia toj promysieł i handal, jaki pierarablaje i eksportuje płady ziemlarobskich haspadarak. Hetamu služać takija viedamyja arhanizacyi, jak „Maistas“, „Pienocentras“ i „Lietukis“. Pamysna raźvivajučysia promysieł i handal dajuć pracu litoŭskamu rabotniku, jaki nie patrabuje dziela hetaha emihravać za hranicu.

Padčyrknuć tak-ža treba vialikija postupy Litvy ŭ halinie raźvićcia knihi, radja, žyćcia arhanizacyjnaha, srodkaŭ kamunikacyi, navuki, sportu i inš.

Usio heta vialikija zdabyčy niezaležnaści Litvy. Ci mieŭ-by heta Litoŭski Narod pry čužoj uładzie? Napeŭna nie! Bo čužyja ŭłady hladziać, kab z čužoha im kraju tolki brać, a nie palapšać jahonaje pałažeńnie. Dziela taho, kožny narod imkniecca da samastojnaści, da ŭłasnaje haspadarstviennaści, a zdabyŭšy jaje ciešycca i baronić.

jns.

Polskaja presa i biełaruskaja prablema

Adnosiny polskaje presy da biełaruskaje prablemy davoli dziŭnyja. Presa heta ahułam abminaje moŭčki ŭsie biełaruskija spravy i starajecca stvarać nastroi, što byccam Biełarusaŭ zusim niama. Ale jak pajaviacca ab Biełarusach artykuły ŭ zahraničnaj presie, tady pačynajecca pisanina i ŭ polskich hazetach, i to jašče jakaja... Chto jak papadzie, na svoj sposab vyjaŭlaje znajomstva biełaruskaje prablemy i kožny pa svojmu jaje raźviazvaje. Adny pišuć, što ŭsio-ž Biełarusaŭ niama,druhija—što jany jošć, ale ich treba vynaradavić, trecija—sami nia znajuć jošć, ci niama, a inšyja kažuć, što Biełarusy nia tolki nie vynaradaŭlajucca, nia tolki nie palanizujucca, ale biełaruščać navat polskich asadnikaŭ, katoryja mieli siarod Biełarusaŭ siejać polskuju kulturu i h.d.

Hetkaja bolš-mienš pisanina pajaŭlajecca ŭ polskaj presie apošnim časam, kali ab Biełarusach pačali pisać hazety francuskija, českija, niamieckija i inšyja, uvažajučy biełaruskuju prablemu daśpiełaj naležnaha raźviazańnia. Čytajučy zahraničnuju presu, polskija hura-patryjoty hublajuć nervy. I tak niejki Skurevič (b. starasta) pabačyŭšy da taho i ŭ polskich hazetach artykuły ab Biełarusach prosta histeryčna kryčyć u „Czerwonej Róży“, što „Biełaruskaj prablemy niama i nia budzie, a jość tolki čužaja dyversyja, na katoruju „adna rada“ — prakuror, kancentracyjnyja łahiery i h. d.“—Z takoj pisaniny pavažnyja ludzi, biazumoŭna, buduć tolki śmiajacca. Navat „Polityka“ — orhan maładych polskich imperyjalistaŭ—u numary z 10.II nazyvaje jaje „škodnym insektam“, pryznajučy, što treba šukać padstavy dziela sužyćcia Biełarusaŭ z polskaj haspadarstviennaściu.

Viedamy „Ilustravany Kurjer Codzienny“ 10.II padaŭ cikavy artykuł ab Vialikaj Biełarusi, u jakim miž inšym piša:

.. „U nadbałtyckich krajoch chodziać dziŭnyja čutki, jakija prajaŭlajucca ŭ hazetnych artykułach, u palityčnych hutarkach i navat u brašurach. Voś-ža ŭ Łatvii, asabliva ŭ Lethalii, siarod biełaruskaha nasielnictva havorać ab novaj respublicy, jakaja maje paŭstać z ziamiel adarvanych ad Łatvii i jakaja maje nazyvacca „Kryvija“. Heta maje być aŭtanomnaja respublika, stvoranaja pa prykładu Zakarpackaj Rusi (Karpackaje Ukrainy—j.n.). Havorać i pišuć,što heta biełaruskaja respublika była-b Pjemontam, jaki pašyryŭ-by svaje ŭpływy na litoŭskuju, polskuju i savieckuju respubliku i davioŭ-by da stvareńnia „vialikaj“ biełaruskaj respubliki. Hetaja respublika była-b etapam niamieckaha pachodu ŭzdoŭž Bałtyku na Maskvu, taksama jak Zakarpackaja Ruś maje być etapam takoha-ž pachodu ŭzdoŭž karpackich horaŭ na Kijeŭ“.

Dziela taho, kaža ŭ kancy „IKC“, „musić vyjści z našaha (polskaha—J. N.) boku natuha apiortaja na tyja dziejniki, jakija farmavali-b našuju misiju na ŭschodzie i na tyja ideały, jakija z Polščy tvaryli-b pryciahvajučy dziejnik dla słabych plamionaŭ“...

Cikavicca biełaruskaj prablemaj i polskaja monarchistyčnaja „N. Przyszłość“, jakaja ŭkładajučy svaju prahramu kaža: „Polšč, Litva, Ruś i Biełaruś musiać znajścisia pad supolnaj strachoj u jakojniebudź formie, jak roŭnyja z roŭnymi, jak supolnyja tvarcy i haspadary specyjalnaha mocarstva, pry tym polskamu narodu apiortamu na najvyšejšyja tradycyi, kulturu palityčnuju i vyrableńnie prypadaje rola „narodu przewodniego“. Adnačasna „N. Prz.“ rukami Biełarusaŭ choča pieramahać Rasiejcaŭ i Ukraincaŭ. Hetych apošnich jana zusim nie pryznaje i na ich miesca sadzić h. zv. Rusinaŭ—adłam Ukraincaŭ, katoryja nia imknucca da samastojnaści. Takim čynam užo vyjaŭlajecca niaščyraść „Naszej Przyszłości“.

Dziela abznajamleńnia z biełaruskaj prablemaj svaich čytačoŭ, „Nasza Przyszłość“ u № 67 za m-c studzień sioleta nadrukavała artykuł bieł. publicysta P. Łastaŭki ab Biełarusach z redakcyjnaj dapiskaj, u jakoj havorycca: Znajomašć z biełaruskaj prablemaj zjaŭlajecca „siańnia tym patrabniejšaj z uvahi na toje, što niekatoryja dziejniki chočuć zakryć samaje isnavańnie biełaruskaha narodu, naiŭna dumajučy, što ŭ sučasnuju paru ahulnaha nacyjanalnaha ŭśviedamleńnia na ŭsim śviecie možna było-b ab niekalki miljonnym narodzie pramaŭčać abo štučna jaho zasymilavać“.

Zusim pravilna. Biełarusaŭ nia možna užo abminuć, schavać, abo zamaŭčać ab ich. Biełarusy žyli i buduć žyć, usio roŭna, ci heta kamu padabajecca ci nie. Chto adnak choča tvaryć asiarodki pryciahvajučyja Biełarusaŭ, pavinien padchodzić da hetaha pavažna i nia z pustymi słavami, a z kankretnymi čynami, katoryja davali-b mahčymašć sužyćcia i razvoju biełaruskaje kultury i haspadarki, a nia z tym, što kapaje roŭ propašci!

J. N.

* * *

Прысьв. М. Дварэцкаму.

Сьвеціць месяц —
месяц сьвеціць.
Серабрыцца белы сьнег.
Ну нашто чупрыну весіць, —
сумаваць людзям на сьмех?

Замяла мяцель дарогі,
занясьлі сьнягі прастор.
Не накорміш сіл зьнямогай,
не падымеш воч да зор.

Клён стаіць купцом багатым,
сьнег цярэбіць з барады;
не дайсьці ніяк да хаты, —
пад сьнягом усе сьляды.

Прыдарожныя бярозы
сьнег калышуць на суччу.
Сьнег і сьнег...
і я праз сьлёзы
больш сьмяяцца не хачу.

Хоць і знаю я што людзі
пракладуць ізноў шляхі.
Смутак ёсьць
і радасьць будзе,
на зямлі ня век сьнягі.

М. МАШАРА

Дзікева, 17.I.39.

Зіма

Заснула возера. Па тонях
ня чутна больш бурлівых хваль.
Кусты аголены. На гонях
ірдзіцца сьнег, бліщчыць, як сталь.

Душа мая адпачывае,
і вока цешыць белы сьнег,
а думка ластаўкай шыбае —
і ня стрымаць-жа яе бег.

Пад белай сьнежнай палатнінай
заснуўшы бачу родны край.
Сплываюць дніпрацёртай каляінай
а ў сэрцы радасьць—прыдзе-ж май!

М. БАЗЫЛЮК

* * *

Ня ў гучнай бяседзе пры піве і мёдзе
Спаткаеш ты друга сабе,
А ў горкай нядолі, ў пакуце і болі
Хто з помачу прыйдзе к табе..

Бо ў гучным настроі,
пры хмельным напоі,
Знай—кожны глядзіць за сябе...
У горы-ж заклятым
і другам і братам
Усякі ўжо будзе табе.

А. МІЛЮЦЬ